УДК 372.882

**М. В. Пабойнева, Т. Л. Харытонава**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Ляснянская сярэдняя школа», аг. Лясная, Рэспубліка Беларусь*

# ПРАБЛЕМЫ ДАБРЫНІ І СУМЛЕННАСЦІ Ў КАЗКАХ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ МІХАСЯ ПАЗНЯКОВА

**Уводзіны.** Міхась Пазнякоў — сучасны беларускі пісьменнік, які піша для дзяцей, працуючы ў розных жанрах. Самая першая яго кніга «Дзіўныя блізняты» выдадзена ў 1987 годзе, складаецца з загадак на беларуска-рускія амонімы, была адрасавана дзецям. Творы для дзяцей М. Пазнякова ўключаны ў школьныя падручнікі, навучальныя дапаможнікі, хрэстаматыі, з імі пачынаюць знаёміцца яшчэ ў дзіцячых садах. Усе яны цікавыя, вясёлыя, займальныя, дасціпныя, пазнавальныя.

Сам пісьменнік адзначае, што ў наш час кнігі для маленькіх чытачоў вельмі запатрабаваныя. «У той жа час дзеці — і мае настаўнікі, яны дапамагаюць адчуваць прыгажосць свету, дабрыню, чалавечнасць. І ўсе гэтыя пачуцці стараюся ўкладваць у творы.  Лічу, што любы пісьменнік павінен быць настаўнікам, нават калі ён і не педагог па адукацыі. Чаму? Таму што сапраўдная літаратура — тая, якая вучыць добраму, вечнаму, светламу» [1].

Добрае, вечнае, светлае — гэта тыя катэгорыі, якія аб'ядноўваюць усе вельмі разнастайныя ў жанравых адносінах творы для дзяцей Міхася Пазнякова.

**Асноўная частка.** Значнае месца сярод дзіцячых твораў Міхася Пазнякова займае літаратурная казка, як вершаваная, так і празаічная.

У казцы, народнай і літаратурнай, заўсёды вырашаліся маральна-этычныя праблемы. «Вялікі выхаваўчы патэнцыял маюць народныя казкі: іх героі бароняць родную зямлю, свой народ, прыходзяць на дапамогу слабым і пакрыўджаным, услаўляюць бескарыснае вернае сяброўства, узаемадапамогу, чысціню чалавечых пачуццяў, прыгажосць як знешняга аблічча чалавека, так і яго ўнутранага свету. Пакаранне зла, перамога дабра, справядлівасці — галоўныя ідэі народных казак. Казка — з'ява, уласцівая духоўнаму жыццю кожнага народа» [2, с. 607]. Асноўныя маральныя законы, якія народ стагоддзямі выпрацоўваў і замацоўваў у творах фальклору, знаходзяць далей сваё мастацкае ўвасабленне ў літаратурных творах беларускіх пісьменнікаў. Ствараючы для дзяцей займальныя і пазнавальныя казкі, пісьменнікі выкарыстоўваюць багатыя традыцыі вуснай народнай творчасці. «Вялікую ролю надаваў Якуб Колас казцы, якая з'яўляецца адной з самых даходлівых форм вобразнага пазнання свету, своеасаблівай гісторыяй і маральным кодэксам, створаным самім народам» [3, с. 18].

У 2013 годзе была выдадзена кніга Міхася Пазнякова «Серабрыстыя чайкі», у якую ўвайшлі апавяданні і казкі для дзяцей. У казках, змешчаных у кнізе, пісьменнік па-мастацку вырашае пытанні сумленнасці і дабрыні.

Галоўнымі героямі вершаваных казак М. Пазнякова з'яўляюцца бядняк і багацей, жывёлы (качаня і пеўнік, малпачка, казёл і зайцы, мядзведзь, вожык, вавёрка, ліса, мышка, сабакі), рыбы (шчупак, карась, сом), матылькі. Аўтар стварае даволі разгорнутыя партрэты сваіх персанажаў, падкрэсліваючы іх унутраныя перажыванні і памкненні. Праз герояў, якія трапляюць у незвычайныя сітуацыі, сустракаюцца з іншымі (часам казачнымі) персанажамі і праходзяць праз пэўныя выпрабаванні, вырашаюцца шматлікія маральна-этычныя праблемы.

У казцы «Бядняк і багацей» галоўныя героі сустракаюцца з незвычайным дзедам, які мае казачную знешнасць: *Барада з ядлоўцу ў дзеда і яловай шышкай нос. Прыкульгаў да рэчкі ледзьве, галавой сівой затрос* [4, с. 7]. Незвычайнасць дзядка неаднаразова ў казцы падкрэсліваецца эпітэтам «*дзіўны*». Гэты дзіўны лесавік, які ледзь кульгае, здолеў тры разы «*смела*», «*лоўка*» і «*спрытна*» нырнуць у рэчку за сякерай.

Сустрэўшы спачатку бедняка, а затым багацея, дзіўны дзядок выпрабоўвае іх. Сумленнага, шчырага, не здольнага на хітрасць, працавітага бедняка ён узнагароджвае залатой сякерай, а прагны, хітры, жадны багацей застаўся ні з чым.

Таямнічы казачны свет створаны пісьменнікам у казцы «Возера Дзіва»: *У краі прыгожым лясным ёсць чыстае возера Дзіва, вада серабрыстая ў ім ад мноства крыніц булькатлівых* [4, с. 12].

Вельмі шчасліва, «*быццам у казцы якой*», жылі жыхары возера Дзіва, не ведалі ніякай бяды, не адчувалі ніякіх трывог, спакойна гулялі «*забаўныя жэўжыкі-дзеці*». Але нечакана аднекуль з'явіўся шчупак, які на дзетак пачаў паляванне: *Такім ненажэрным быў ён,і рыбу бяда ўсхвалявала: за некалькі восеньскіх дзён паніпічыў ён рыбак нямала* [4, с. 14].

У гэтай казцы важнымі з'яўляюцца аўтарскія характарыстыкі, у якіх падкрэсліваюцца ўнутраныя якасці персанажаў. Мудрым гаспадаром, які можа даць параду, паказаны сом, але яму не хапае рашучасці ў крытычнай сітуацыі. «*І спрытны, і шпаркі шчупак, хіба мне за гэткім угнацца?*» — гаворыць сом. Баязлівымі намаляваны качкі: «*тут боязна плаваць і нам*». Ненажэрлівага, спрытнага «*драпежніка злога*» шчупака змаглі перамагчы ўсе разам толькі дзякуючы розуму і кемлівасці старэйшага карася, які гаварыў, што заўсёды перад любой справай «*спачатку падумаць не шкодзіць*».

Чысціня сяброўскіх узаемаадносін як важная каштоўнасць падкрэсліваецца М. Пазняковым у казках «Тры матылькі» і «Качаня і пеўнік».

Тры матылькі, чырвоны, белы, жоўты, вымакнуўшы пад моцным дажджом, з годнасцю прайшлі выпрабаванне на вернасць свайму сяброўству. Чырвоны цюльпан мог даць прытулак толькі чырвонаму матыльку, «*бо на мяне*

© Пабойнева М. В., Харытонава Т. Л., 2022

Рэпазіторый БарДУ

*адзін якраз падобны ён найболей*», белая лілея — беламу, жоўтая ружа — жоўтаму. Але зайздросным кветкам адзін за адным змучаныя сябры адказвалі: «*Не толькі я наскрозь прамок, адзін не застануся*». Шчырыя словы сяброў прынеслі ім выратаванне. Пачуўшы гэтыя словы, мацней засвяціла сонца: *Вітаю дружбу на зямлі, сапраўдную, святую… Як будзе хараша, калі сябрам дапамагу я* [4, с. 14].

У казцы «Тры матылькі» пісьменнік прыгожа па-мастацку намаляваў адзін са спрадвечных законаў існавання чалавечага грамадства, сцвярджаючы, што «*дружба — у бядзе вялікая падмога*». Шчырыя, спагадлівыя адносіны паміж сябрамі на прыкладзе галоўных герояў можна ўбачыць і ў казцы «Качаня і пеўнік».

Усім вядомая народная мудрасць пра тое, што любую пачатую справу трэба даводзіць да канца, знайшла ўвасабленне ў казках М. Пазнякова. У невялікай па памеры казцы «Малпачка» вельмі маляўніча створаны вобраз галоўнай гераіні, якой хацелася ўсяго, што яна бачыла (і кукурузы, і персікаў, і кавуноў), але дадому яна вярнулася з пустымі рукамі, бо адна справа перашкджала другой.

На Малпачку вельмі падобны касалапы Мішка з «Казкі пра Мядзведзя». Усе лясныя жыхары рыхталіся да зімы. Заяц моркву гадаваў, Вожык баравікі збіраў, Вавёрка ў арэшніку арэхі рвала, Мышка зерне аўса зрывала. Мядзведзь жа без харчоў застаўся, «*бо як след не рыхтаваўся*». За ўсё Мішка браўся, ды нічога не зрабіў, а толькі стаміўся і заснуў да вясны, «*смокча лапу, бо гуляка, ды й худзее небарака*».

У вершаваных дзіцячых казках Міхася Пазнякова значную ролю адыгрывае аўтарскі пачатак. Сама форма вершаванай казкі робіць яе непадобнай да фальклорнай (толькі празаічнай) казкі. У творах М. Пазнякова ёсць разгорнутыя  партрэтныя і псіхалагічныя апісанні персанажаў, разнастайныя пейзажныя замалёўкі. Часам у канцы казкі змяшчаецца мараль, чаго няма ў фалькорнай казцы (там мараль звычайна хаваецца ў падтэксце).

У празаічных аўтарскіх казках М. Пазнякова ёсць прыкметы не толькі фальклорных казак, але і такіх жанраў як легенда і паданне. У некаторых з гэтых твораў тлумачацца назвы кветак і жывёл, згадваюцца рэальныя геаграфічныя мясціны (Брагіншчына, Палессе, Нарач). Празаічныя казкі пісьменніка маюць выразную маральную скіраванасць.

Героі празаічных казак сваёй дабрынёй і сумленнасцю мяняюць да лепшага навакольны свет. Гэта, напрыклад, вожык Клапатун з казкі «Чараўнік зеленакветкавы», кветка Мнаганожка (казка «Мнаганожка»), сава Сіпуха (казка «Сіпуха»), вавёрка-выратавальніца (казка «Зайчык»).

Пісьменнік характарызуе некаторых персанажаў сваіх казак праз іх гаваркія імёны. Імя вожыка — Клапатун, бо клопат пра ўсё і пра ўсіх — асноўная рыса гэтага героя: «*Ён і сапраўды шчыраваў на сваёй палянцы з самай раніцы да позняга вечара. То хатку сваю папраўляў, то кладоўку абсталёўваў, то ў лясочку парадак наводзіў. Ды самым любімым заняткам у яго была праца ў невялікім садзе-агародзе. Што толькі не вырошчваў руплівы гаспадар!*» [4, с. 33]. Шматлікія вобразныя азначэнні, якія ўжывае аўтар ў дачыненні да вожыка, яшчэ больш падкрэсліваюць яго імя: *працавіты, мудры, разумны, руплівы, шчыры, сардэчны, рахманы*. Але разам з тым і вельмі сціплы, не лічыць сябе галоўным чараўніком у лесе. Вылечыўшы малых парсючкоў ад хваробы, Клапатун гаворыць, што дзякаваць за гэта трэба лекавую кветку чараўніка зеленакветкавага, а не яго. Асноўная ідэя казкі гучыць з вуснаў вожыка Клапатуна: «*Шануйце, беражыце ўсё прыгожае і жывое ў нашым лясочку!*».

Дабрыня і сціпласць — асноўныя рысы, якія характарызуюць папараць Мнаганожку з аднаіменнай казкі. Спрачаліся і выхваляліся расліны і кветкі. Самай прыгожай называла сябе Душыца: «*Паглядзіце, якая я прывабная! Панюхайце, якая духмяная!*». Самай лепшай у свеце — Чорнагалоўка: «*Ніхто гэтак, як я, не падабаецца мушкам і камарыкам!*». Самай адважнай і смелай лічыла сябе Крапіва, а Тысячагалоў гаварыў, што ён «*высокі і прыгожы станам*». Маўчала і не выхвалялася толькі Мнаганожка. Але, калі раптам загрымеў гром і ўпалі на расліны буйныя кроплі дажджу, толькі Мнаганожка прыйшла на дапамогу маленькай спалоханай сунічцы, прыкрыўшы яе сваім лісточкам.

Акрамя папараці Мнаганожкі, у казках Міхася Пазнякова створаны і іншыя вобразы герояў-выратавальнікаў. Гэта сава Сіпуха (казка «Сіпуха»), якая асіпла, ратуючы вёску ад пажару: «*З таго дня Сіпуха стала не толькі гераіняй вёскі, але і ганаровым яе жыхаром. Кожны стараўся аддзячыць ёй нечым смачным*» [4, с. 33]. Вавёрка, якая выратавала маленькага зайчыка ад ліса (казка «Зайчык»). Сава і дзяцел, якія не пакінулі ў бядзе вавёрку і дапамаглі ёй зрабіць новае жытло (казка «Вавёрчына хатка»). Каршун з каршуніхай, якія мужна ратуюць гняздо з каршунятамі ў час ляснога пажару (казка «Чырвоныя каршуны»). Бабёр Зубасцік і бабрыха Тупа, якія паставілі на ногі і дапамаглі перажыць зіму параненай чаплі (казка «Белая чапля»).

**Заключэнне.** Міхась Пазнякоў, ствараючы для сваіх маленькіх чытачоў незвычайны казачны свет, пасяліўшы ў ім казачных і набліжаных да рэальнасці герояў, арыентуецца на спрадвечныя агульначалавечыя духоўныя каштоўнасці, вучыць дабрыні і справядлівасці.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. Паэт Міхась Пазнякоў — аб літаратуры для дзяцей, малой радзіме і падтрымцы таленавітай моладзі [Электроны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://www.sb.by/articles/pismennik-mikhas-paznyako-mae-nasta-niki-dzetsi.html . — Дата доступу: 07.09.2022.
2. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2005. — Т. 1. — 607 с.
3. *Колас, Я.* Другое чытанне для дзяцей беларусаў: апавяданні, вершы, байкі, казкі / Я. Колас ; прадм. І. М. Саматыі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. — 182 с.
4. *Пазнякоў, М.* Серабрыстыя чайкі: казкі, апавяданні / М. Пазнякоў ; маст. В. А. Макаранка. — Мінск : Звязда, 2013. — 112 с.


Рэпазіторый БарДУ